19. Юнг Карл Густав. Архетип і несвідоме : пер. з нім. / Карл Густав Юнг. – К.: Український письменник, 2014. – 358 с. (Світло світогляду).

*У.А. Трапянок (Мінск)*

## ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ДРАМАТУРГІІ КАНДРАТА КРАПІВЫ ПРАЗ МАС-МЕДЫЯ БЕЛАРУСІ

Драматургічная спадчына Кандрата Крапівы налічвае 12 п'ес, якіх стала дастаткова, каб імя аўтара ўвайшло ў залаты фонд беларускай літаратуры і нацыянальнага тэатра. Зварот да драматургіі адбыўся ў Кандрата Крапівы ў 1933 г., калі кіраўніцтва Першага беларускага тэатра папрасіла яго перакласці на беларускую мову камедыю «Недаростак» Д. Фанвізіна. Пазней, будучы знакамітым, драматург сказаў: «… у мяне, дзякуючы знаёмству з лепшымі ўзорамі рускай драматургіі, выпрацаваліся пэўныя ўяўленні пра асаблівасці драматургічнага жанру, пра тыя неабходныя якасці, якімі мусіць валодаць твор, прызначаны для сцэны» [4, с. 155]. Дзякуючы мас-медыя, увасобленыя на падмостках пастаноўкі набылі новае жыццё, інтэрпрэтацыі драматургіі, створаныя па законах аўдыя- і відэаўспрымання, перайшлі ў ранг зафіксаваных узораў мастацтва, даступных некальнім пакаленням беларусаў. Драматургічны почырк Крапівы і адметнасці ўвасаблення п'ес аўтара на сцэне падрабязна даследавалі С. Лаўшук, А. Сабалеўскі, А. Кучар і інш. На аснове навуковых работ, практычнага вывучэння фондаў беларускага радыё і тэлебачання, а таксама інтэрнэту мы вызначылі, якія п'есы Кандрата Крапівы аказаліся запатрабаванымі ў СМІ і што з запісанага раней матэрыялу даступна цяперашнім і будучым пакаленням.

Першы драматургічны твор Кандрата Крапівы «Канец дружбы», напісаны ў 1933 г., быў сярод першых арыгінальных матэрыялаў для радыётэатра. Аўтар дазволіў адаптаваць п'есу для эфіру [3, с. 54]. Супрацоўнікаў радыё, верагодна, падкупляла наяўнасць доўгіх маналогаў, у якіх шмат рыторыкі і мала дзеяння, што адпавядала асаблівасцям вяшчання. Прагучала на радыё, хутчэй за ўсё, і пастаноўка БДТ-1 1934 г., рэжысёрамі якой выступілі Л. Літвінаваў і Л. Рахленка, паколькі тэатры былі абавязаны прадастаўляць для эфіру свае работы. Сцэнічны твор атрымаўся павярхоўным, драматург спрабаваў пераканаць рэжысёраў адысці ад схематызму, дагматычнай трактоўкі сітуацый і вобразаў, але яму гэта не ўдалося [2, с. 23]. Удалым спектакль «Канец дружбы» стаў для выканаўцы ролі Карнейчыка У. Крыловіча. Ён уклаў у вобраз шмат эмоцый, пачуццяў, ператварыў Карнейчыка ў героя свайго часу. Сцэны з радыёверсіі спектакля «Канец дружбы», запісанага ў 1954 г., захоўваюцца ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск), а значыць, доступ да іх абмежаваны.

У 1952 г. у фонды Беларускага радыё паступіла радыёкампазіцыя спектакля па аднайменнай драме Кандрата Крапівы «Партызаны», пастаўленага ў Першым беларускім дзяржаўным тэатры Л. Рахленкам і К. Саннікавым у 1938 г. П'еса вызначалася шырокай панарамнасцю ў паказе падзей грамадзянскай вайны, калі працоўныя масы змагаліся за вызваленне ад польскіх легіянераў, вялікай колькасцю дзеючых асоб і шчодрым уключэннем фальклорнага матэрыялу. Запіс захаваў галасы выканаўцаў У. Уладамірскага, А. Бараноўскага, Б. Янпольскага, Г. Глебава, І. Шацілы, В. Полы, Л. Ржэцкай і інш. [4, с. 175]. Спектакль вызначаўся грамадзянскім пафасам, маляўнічасцю, зладжанасцю, ансамблевасцю, што адчуваецца і ў радыёверсіі.

У 1939 г. у Першым беларускім дзяржаўным тэатры адбылася прэм'ера спектакля «Хто смяецца апошнім» на аднайменнай сатырычнай камедыі Кандрата Крапівы [4, с. 183]. Над пастаноўкай працавалі І. Раеўскі (рэжысёр МХТ) і Л. Рахленка. Спектакль з'яднаў вялікую колькасць акцёрскіх талентаў. У ролі Тулягі выступіў Г. Глебаў, якому, як і аўтару п'есы, што ўвайшла ў залаты фонд савецкай камедыяграфіі, прысудзілі Дзяржаўную прэмію СССР [2, с. 112]. У складзе выканаўцаў былі Л. Рахленка, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, Г. Грыгоніс, С. Станюта, В. Пола і інш. Для кожнага артыста роля ў спектаклі «Хто смяецца апошнім» стала знакавай у творчай біяграфіі. Пастаноўка мела поспех на сцэне, падчас Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, у іншых гарадах Расіі, ва Украіне. Стала яна даступнай і для радыёаўдыторыі, калі ў 1951 г. адбыўся запіс спектакля для радыёфондаў. Радыёкампазіцыя «Хто смяецца апошнім» даступна

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУ

карыстальнікам інтэрнэту на сайце www.abook-club.ru, а значыць, у любы зручны час рэцыпіент можа трапіць у абставіны, акрэсленыя драматургам і рэжысёрамі, адчуць эмоцыі акцёраў, пасмяяцца з прапанаваных сітуацый і г. д. Інтэрнэт стаў зручнай платформай для функцыянавання аўдыя- і відэатвораў з захаваннем мастацкіх прыёмаў пастаноўшчыкаў для некаторых іншых спектакляў паводле Крапівы.

У 1943 г. драматург напісаў п'есу пра падзеі вайны «Проба агнём». У тым жа годзе яна была пастаўлена ў Другім беларускім дзяржаўным тэатры. На Беларускім радыё захоўвасцца запіс 1969 г., у якім ролі выконвалі артысты Тэатра імя Якуба Коласа. Рэжысёрам радыёверсіі выступіла М. Троіцкая, за аснову ўзята пастаноўка рэжысёра С. Казіміроўскага.

У 1945 г. Кандрат Крапіва скончыў пісаць сатырычную камедыю «Мілы чалавек», якую, як адзначае С. Лаўшук, аднеслі да аднаго з самых дасканалых твораў савецкай драматургіі сярэдзіны 1940-х гг. [2, с. 166]. П'еса высмейвае такую з'яву, як «жлуктаўшчына» (па прозвішчы галоўнага героя аферыста Дзям'яна Жлукты). На сцэне Тэатра імя Янкі Купалы аднайменны спектакль ставіў І. Раеўскі. У ролях задзейнічаны Б. Платонаў, З. Стома, У. Уладамірскі, Э. Шапко, Р. Кашэльнікава [2, с. 167]. Хутка пастаноўка трапіла ў лік апальных і была знята з рэпертуару. Новае жыццё п'есе надала яе публікацыя ў 1956 г. у зборы твораў Кандрата Крапівы, пачалася рэабілітацыя твора. У 1960-я гг. аднайменную аўдыяпастаноўку маглі чуць прыхільнікі радыётэатра. У 1989 г. у беларускім тэлетэатры звярнуліся да п'есы К. Крапівы «Мілы чалавек» і паставілі аднайменны тэлеспектакль. Рэжысёр А. Каламіец дазволіла сабе перайначыць класіка: апусціла трывіяльныя празмернасці асобных сцэн і паспрабавала нібы знутры «падсвяціць» галоўных персанажаў, пазбягаючы іх плакатнай аднамернасці [1, с. 234]. У тэлеспектаклі вылучаецца вобраз драматурга-камедыёграфа Язвы, якога сыграў В. Манаеў. Язва піша камедыю, цэнтральным героем якой выступае яго сусед махінатар Жлукта – Чарскі.

У Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў маюцца сцэны з аўдыяспектакля «З народам». Плёнку з запісам у архіў перадало Беларускае радыё, а значыць, з аднайменнай п'есай К. Крапівы ў свой час пазнаёміліся радыёслухачы. П'еса аказалася адной з самых слабых. Крытыкі не маглі прыйсці да адзінага меркавання ў адзнацы пастаўленага ў Тэатры імя Янкі Купалы К. Саннікавым спектакля па п'есе «З народам», але фондавы запіс сведчыць, што пастаноўку перадавалі на радыёхвалі, а значыць, аўдыторыя магла па-свойму ацаніць работу.

Прыхільна прынятым радыёспектаклем называюць лірычную камедыю пра калгаснае жыццё пасляваенных гадоў «Пяюць жаваранкі». Гэту п'есу ў 1950 г. у Тэатры імя Янкі Купалы паставіў рэжысёр К. Саннікаў. Як пісалі крытыкі, паэтычна прыўзняты твор з чыстымі інтанацыямі, светлай узнёсласцю ў 1952 г. адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. Пастаноўка вызначалася акцёрскімі работамі, у прыватнасці, як пісаў А. Сабалеўскі, свае найлепшыя сцэнічныя вобразы ў спектаклі стварылі У. Дзядзюшка і В. Пола [4]. Беларускае радыё не магло застацца ў баку ад знакавай тэатральнай работы, і ў 1952 г. з'явіўся аднайменны радыёспектакль, які па сённяшні дзень захоўваецца ў фондах. Ролі ў аўдыяверсіі выконвалі акцёры Тэатра імя Янкі Купалы.

У архіве Беларускага радыё маецца радыёкампазіцыя спектакля па п'есе Кандрата Крапівы «Людзі і д'яблы». Запіс зроблены на наступны год пасля прэм'еры ў 1958 г. Крытыкі назвалі п'есу «самай псіхалагічнай у дзейнасці аўтара» [4, с. 249]. Рэжысіраваў спектакль у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы К. Саннікаў, асноўную ўвагу ў пастаноўцы ён скіраваў не на галоўнага героя-здрадніка, якога празвалі д'яблам, а на раскрыццё станоўчых персанажаў, якіх ігралі мэтры сцэны І. Шаціла, Л. Ржэцкая, У. Дзядзюшка, І. Ждановіч і інш.

У 1972 г. Крапіва скончыў «фантастычную камедыю» «Брама неўміручасці». Гэта яшчэ адна запатрабаваная ў мас-медыя работа па п'есе драматурга, якая захоўвасцца ў фондах радыё, тэлебачання, а таксама ў інтэрнэце ў аўдыя- і відэа(тэле)варыянтах. Прапісаныя Кандратам Крапівой сцэны, дзе герой Дабрыян апеліруе да гледачоў, не маглі не зацікавіць творцаў тэлебачання. Камедыя сталася «да часу» і ў тэатры, і на ТБ. У 1974 г. п'есу ў Тэатры імя Янкі Купалы паставіў В. Раеўскі, атрымаўся фантасмагарычны спектакль, які, як пісаў А. Сабалеўскі, слаба раскрываў глыбінны філасофскі змест, закладзены драматургам [4, с. 279]. Паводле сцэнічнай інтэрпрэтацыі ў 1978 г. тэлеверсію запісаў рэжысёр У. Міхарскі. Ён перанёс дзеянне ў паўкасмічную прастору, якая крыху дысаніравала з рэалістычнай ігрой артыстаў, але падкрэслівала абсурднасць тэмы, што ўздымаецца ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

рабоце. У тэлеспектаклі ролі выконвалі акцёры П. Дубашынскі, Л. Волкава, С. Бірыла, З. Браварская, Н. Пекур, Л. Рахленка, Г. Макарава, М. Кірычэнка, А. Памазан, С. Станюта, З. Стома і інш. Над радыёкампазіцыяй, запісанай у 1982 г., працавала рэжысёр С. Гурыч. На ролі былі запрошаны артысты Беларускага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Аўдыяварыянт выйграе ў параўнанні з тэлеверсіяй, наколькі вобразы, абставіны, у якіх разгортваецца дзеянне, нараджаюцца ва ўяўленні слухача, а значыць, не прыстасоўваюцца да прапанавых дэкарацый і мізансцэн, даючы магчымасць кожнаму «ствараць» уласны спектакль.

Апошні драматургічны твор Кандрата Крапівы – «На вастрыі». А. Сабалеўскі назваў яго «камерным» [4, с. 285] і пісаў, што п'есе не стае шырокага дыхання, маштабнасці, уласцівых іншым творам драматурга. Спектакль па гэтай п'есе, які назвалі «Блытаныя сцежкі», у Беларускім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа ў 1983 г. паставіў В. Мазынскі. Галоўных персанажаў Галубовіча і Грушэўскага сыгралі У. Куляшоў і Ф. Шмакаў. Пастаноўцы не хапала яркасці, напоўненасці. Яна ішла ў заніжаным тонусе, таму няшмат праіснавала ў рэпертуары [4]. Тым не менш, у фондах Беларускага радыё захоўваецца яе аўдыяверсія, над якой працавала радыёрэжысёр С. Гурыч. У 1986 г. рэжысёр У. Станкевіч паставіў па п'есе «На вастрыі» аднайменны тэлевізійны спектакль [5].

Такім чынам, найбольш адкрытым да драматургіі Кандрата Крапівы стаў радыётэатр. У розны час ён пазнаёміў слухачоў з большай часткай п'ес народнага пісьменніка Беларусі. Гэта былі трансляцыі з тэатральных залаў, радыёкампазіцыі паводле спектакляў, аўтарскія версіі. Сённяшняму слухачу даступны фондавыя запісы, перадача ў эфір якіх актуалізуецца ў юбілейныя гады з дня нараджэння Кандрата Крапівы. У беларускім тэлетэатры драматургія класіка не знайшла шырокага ўвасаблення: зафіксаваны зварот толькі да некаторых п'ес. Тры спектаклі (два ў аўдыяфармаце, адзін – тэлевізійны) запампаваны ў інтэрнэт (сайты www.abook-club.ru, www.youtube.com) і пастаянна адкрыты для доступу. Дзякуючы радыё, тэлебачанню і інтэрнэту, драматургічная спадчына Кандрата Крапівы ў мастацкім прачытанні шматлікіх рэжысёраў даступна сучаснікам і захавана для папулярызацыі сярод наступных пакаленняў беларусаў.

**ЛІТАРАТУРА:**


1. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. Т. 3 : Тэлевізійнае кіно (1956–2002 гг.) / В.Ф. Нячай, В.А. Мядзведзева, Н.А. Агафонава ; навук. рэд. В.Ф. Нячай. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 374 с.
2. Лаўшук, С.С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С.С. Лаўшук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 240 с.
3. Радкевіч, Я.Р. Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я.Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 197 с.
4. Сабалеўскі, А.В. Кандрат Крапіва. Постаць і творы / А.В. Сабалеўскі. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Нар. асвета, 2003. – 301 с.
5. Фральцова, Н.Ц. Тэлевізійны тэатр / Н.Ц. Фральцова // Тэатральная энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2 : Лабанок – Янчур / рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2003. – С. 454–457.



***А.В. Безручко (Киев, Украина)***


## ЭКРАНИЗАЦИЯ ЛИТЕРАТУРНЫХ ПРОИЗВЕДЕНИЙ ПРО ВЕЛИКУЮ ОТЕЧЕСТВЕННУЮ ВОЙНУ ПАРТИЗАНСКОГО ГЕНЕРАЛА П.П. ВЕРШИГОРЫ

Военный писатель, историк, режиссер кино и театра, общественный деятель, генерал-майор, лауреат Государственной премии СССР (1947) Петр Петрович Вершигора (3.05.1905, с. Севериновка, Рыбоводческого р-на, Молдова – 27.03.1963, Москва) известен, в первую очередь, как храбрый партизан. Под его руководством Первая Украинская партизанская дивизия им. С.А. Ковпака осуществила рейд в Белоруссию (район Беловежской Пущи, Гродно и т.д.), за что он и удостоился высокого звания Герой Советского Союза.

Широкую известность получила и его литературная деятельность: П.П. Вершигора – автор документально-беллетристических произведений о партизанах: «Люди с чистой совестью» (1946;



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ